# ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІСТЫ АБ УЗАЕМАСУВЯЗІ АСОБЫ І ГРАМАДСТВА

У.У.Трамбіцкі

Доўгі час у вучэбнай і навуковай літаратуры па марксісцка-ленінскай філасофіі праводзілася думка, што інтарэсы грамадства павінны ставіцца вышэй інтарэсаў асобы. У цяперашні час другія адносіны як да марксісцка-ленінскай філасофіі, так і да замежнай філасофіі. У замежнай філасофіі узаемасувязь асобы і грамадства своеасабліва адлюстравалася у экзістэнцыяльнай філасофіі. Ёсць сэнс спыніцца на гэтым пытанні. Але у тэзісах падрабязна апісаць узаемасувязь асобы і грамадства немагчыма. Таму спынюся на поглядах А.Камю, К.Г.Юнга, Х.Артэга-і-Гасета.

Не будзем спыняцца на дэталевым аналізе усіх прац яркіх філосафаў XX ст., звернемся толькі да некаторых з іх. Напрыклад, у працы "Бунтуючы чалавек" Альбер Камю у бунце раба бачыць не толькі поўны псіхалагічны стан, але і пераход мяжы, па-за якою чалавек патрабуе, каб з ім абыходзіліся як з роўным. Чалавек-бунтар ставіць пад пагрозу свой лес дзеля дабрабыту, які ен цэніць вышэй за сваё жыццё. "Значыць, ен дзейнічае у імя яшчэ невыразнай каштоўнасці, адчуваючы, што яна родніць яго з усімі людзьмі". Вось чаму А.Камю чалавечую салідарнасць называе метафізічнай. Салідарнасць сведчыць аб сувязі "я" і грамадства і аб узрастаючай самастойнасці чалавечага роду. На думку А.Камю, бунт вызваляе чалавека ад адзіноцтва.

К.Г.Юнг, ставячы пытанне аб душы сучаснага чалавека, выходзіць за рамкі індывідуальнага чалавека і звяртаецца да чагосці універсальнага. Сучасны чалавек, па Юнгу, толькі той, хто "поўнасцю усвядоміў цяперашнее". Такі чалавек ва усе часы быў адзінокі, бо свядомасць заўсёды аддаляла яго ад паглыбленасці у бессвядомасць. Нават у цывілізаваным грамадстве шмат якія людзі жывуць у стане бессвядомасці. Таму сучасны чалавек негісторычны і адчужаецца ад масы людзей, якія жывуць традыцыяй, адказваецца ад святасці, падоранай гісторыяй - гэта яго Праметэеў грэх. "Вышэйшы узровень свядомасці падобны абцяжар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці віной". Душа чалавека, на думку Юнга, калі ён выходзіць за рамкі рэлігіі, пачынае функцыяніраваць па свайму уласнаму праву. Змены у калектыўнай душы адбываюцца адпаведна таму ўзору, што і у індывідуальнай. Пагэтаму, мяркуе Юнг, "калі раней я лічыў, што маім абавязкам было заклікаць іншых да парадку, то цяпер я разумею, што мне патрэбна заклікаць да парадку самога сябе, што для пачатку мне неабходна прывесці у парадак свой уласны дом". Толькі зазірнуўшы у тайнікі свайй уласнай душы, можна выявіць жахлівае відовішча сляпога свету. А тэасофія свайй дактрынай кармы і перараджэння вучыць нас таму, што гэты свет з'яўляецца толькі лячэбніцаю для маральна недасканалых. Таму "сучасны чалавек ідзе да ўнутранага, да усведамлення цемных асноў душы".

Х.Артэга-і-Гасет у працы "Паўстанне мас", у адрозненне ад звыклых падыходаў да сацыяльнай структуры грамадства, лічыць, што "... самым глыбокім і радыкальным падзелам чалавецтва на групы было б адрозненне іх па двух асноўных тыпах: на тых, хто строгі і патрабавальны да самога сябе ("падзвіжнікі"), грызе на сябе працу і абавязак, і тых, што задаволены сабою, хто жыве без намаганняў, не імкнучыся сябе паправіць і палепшыць, хто жыве па цячэнню". Іспанскі філосаф лічыць, што у грамадстве ёсць справы і прафесіі, якія патрабуюць спецыяльных якасцей людзей. Ход жа гістарычнага развіцця характарызуецца тым, што масы пачынаюць выконваць тыя функцыі, якія раней выконвала выбраная меншасць: "Суверэнітэт любога індывіду, чалавека як такога, выйшаў са стадыі абстрактнай прававой ідэі ці ідэала і ўкараніўся у свядомасці пасрэдных людзей. Заўважце: калісьці, што было ідэалам, становіцца рэчаіснасцю, яно непазбежна траціць арэол. Арэол і магічны бляск, што прываблівацць чалавека, знікаюць. Роўнасць праваў - высакародная ідэя дэмакратыі - перарадзілася на прагу і задавальненне апетытаў і падсвядомых жаданняў". Працэс жа змены месца і ролі мас у грамадстве суправаджаецца павелічэннем узроўню жыцця. Гэты працэс вядзе да нівеліроўкі багаццяў, праваў, культуры, класаў, полаў. Чалавек масы як наследнік развіцця грамадства эбалаваны наваколным светам. Таму ён не жадае лічыцца ні са знешнімі інстанцыямі, ні з аўтарытэтамі. Атрымліваецца так, што "як толь-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

кі свет і жыццё шырока адкрыліся звычайнаму чалавеку, душа яго для іх закрылася". Чалавек мас, чалавек "прамога дзеяння", а не для дыскусій. Такі чалавек не прымае аналізацый. Чалавек мас жыве лепш у параўнанні са сваімі папярэднікамі, але ён – прымітыў, першабытны чалавек у цывілізаваным свеце, варвар. Бальшавізм і фашызм, на думку Х.Артэга-і-Гасета, – два яркія прыклады рэгрэсу.

Такім чынам, узаемасувязь каштоўнасцей грамадства і каштоўнасцей асобы ў экзістэнцыяльнай філасофіі тлумачыцца не толькі традыцыямі.

## КАМПЛЕКТАВАННЕ І ВЫКАРЫСТАННЕ ФОНДАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭКАХ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

І.М.Стрыжонак

З пашырэннем беларускай мовы і набыццём ёю статуса дзяржаўнай мяняецца моўная структура фондаў масавых бібліятэк рэспублікі на карысць беларускамоўных публікацый. Колькасныя і якасныя змены ў фондах масавых бібліятэк цесна звязаны з развіццём кнігавыдання на беларускай мове. Аналіз структуры кнігавыдання на беларускай мове за 10 гадоў (1978-1988 гг.) паказаў, што асноўны прырост прыйшоўся на мастацкую і дзіцячую літаратуру і склаў адпаведна па назвах 14,6% і 12,3%, па тыражах – 35,9% і 29,6%. У той жа час скараціўся выпуск вучэбнай і галіновай літаратуры адпаведна на 20,6% і 1,1% па назвах, па тыражах на 15,3 і 36,4%. Назіраўся даволі высокі тэмп росту выпуску беларускай літаратуры на рускай і замежных мовах, таму удзельная вага выданняў на беларускай мове ў агульным выпуску за 10 гадоў знізілася з 64,5% да 44%. І толькі ў апошнія гады (з 1989 г.) пачалося павелічэнне часткі беларускай літаратуры на нацыянальнай мове ў агульным аб'ёме кнігавыдання.

У публічных масавых бібліятэках Беларусі рэспубліканскія выданні складаюць па назвах да 17%, а па экземплярнасці да 30% ад агульнага аб'ёма фондаў. У масавых бібліятэках Мінскай воб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ